72.036
З-381

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Філіял «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы»

Ю. Ю. ЗАХАРЫНА

# СУЧАСНАЯ АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ

## эвалюцыя мастацкіх вобразаў у сусветным кантэксце

Ф.К.

Мінск
«Беларуская навука»
2014

Президентская библиотека
Республики Беларусь
7 700001 275546

УДК 72.03(476)
ББК 85.113(4Бен)
З-38

Р э ц э н з е н т ы:

доктар мастацтвазнаўства В. І. Жук,
кандыдат мастацтвазнаўства дацэнт М. Р. Баразна

**Захарына, Ю. Ю.**

З-38 Сучасная архітэктура Беларусі : эвалюцыя мастацкіх вобразаў у сусветным кантэксце / Ю. Ю. Захарына ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 371 с. : іл.

ISBN 978-985-08-1660-3.

Прадстаўленая кніга – першае ў мастацтвазнаўстве фундаментальнае даследаванне пазіцыяніравання і эвалюцыі мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры Беларусі ў кантэксце сацыякультурнай глабалізацыі. Сучасная архітэктура інтэрпрэтуецца на аснове тэарэтычнай канструкцыі з вылучэннем і раскрыццём спецыфікі яе атрыбутыўных складнікаў (прасторы, формы, канструкцыі, кампазіцыі і ансамбля), а такама скрозь прызму прасторава-часавага кантынуума. Прапанаваная аўтарам мастацка-вобразная канцэпцыя дазваляе раскрыць сутнасць і спецыфіку катэгорыі «мастацкі вобраз архітэктуры» ў адзінстве трох сэнсавых іпастасей – фенаменалагічнай, працэсуальнай (эвалюцыйнай) і рэпрадуцыраванай экзістэнцый, вылучыць і ахарактарызаваць этапы і акрэсліць тэндэнцыі развіцця сучаснай архітэктуры Беларусі.

Адрасуецца мастацтвазнаўцам, архітэктарам, культуролагам, а таксама ўсім, хто цікавіцца мастацкім аспектам развіцця архітэктуры.

**УДК 72.03(476)**
**ББК 85.113(4Беи)**

**ISBN 978-985-08-1660-3**

© Захарына, Ю. Ю., 2014
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2014

# УВОДЗІНЫ

Сучасная архітэктура Беларусі разнастайная па сваіх функцыянальна-тэхнічных і мастацка-эстэтычных прыкметах, сфарміраваных ва ўмовах інтэграцыі набыткаў тэхнагеннай цывілізацыі сусветнага маштабу. Варыятыўнасць мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры рэспублікі, што вызначае яе адметнасць, з'явілася вынікам сімбіёзу традыцыйных і інавацыйных падыходаў да архітэктурна-праекціровачнай, будаўнічай і дызайнерскай дзейнасці, якія адпавядаюць патрабаванням постіндустрыяльнага грамадства. Такая сацыякультурная сітуацыя стварыла ўмовы для ўсталявання і трансфармацыі мастацка-вобразнай сістэмы архітэктуры, заснаванай на суіснаванні бінарных полюсных пачаткаў, увасобленых у мастацкіх ідэях, мастацкіх задумах, мастацкіх вобразах: нацыянальнага і інтэрнацыянальнага, традыцыйнага і авангарднага, рацыянальнага і ірацыянальнага, статычнага і дынамічнага, што здолелі адлюстраваць дыялог гістарычна сфарміраванай і сучаснай культур.

У тэорыі архітэктуры і мастацтвазнаўстве праблема фарміравання і развіцця мастацкіх вобразаў заўсёды вылучалася як асноўная і знаходзілася ў цэнтры ўвагі вядучых тэарэтыкаў. Актуальнасць і глыбіня праблемы асэнсавання мастацкіх вобразаў прывяла да вылучэння яе і ў іншых гуманітарных навуках. Мастацкі вобраз дае пачуццё і разуменне адзінства ўсяго існага праз вызначэнне канкрэтных якасцей, прадметаў, праз сваю цэласнасць і адносную самастой-

насць – самабытнасць – і вылучаецца як асобная катэгорыя мастацтва.

Фарміраванне мастацкіх вобразаў дойлідства ўяўляе складаны эвалюцыйны працэс, у якім удзельнічаюць эстэтычныя, грамадскія, сацыяльныя катэгорыі і прынцыпы. Таму для раскрыцця праблемы эвалюцыі мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры Беларусі неабходным з'яўляецца вызначэнне ключавых тэрмінаў і паняццяў, звязаных з мастацка-эстэтычнай выразнасцю, улік трактоўкі катэгорыі «мастацкі вобраз» у разнастайных сферах гуманітарнай навукі ў розныя гістарычныя перыяды, якія складаюць тэарэтычную базу даследавання. Шырыню і цэласнасць пастаўленай праблемы вызначае аналіз навуковых прац тэарэтыкаў і гісторыкаў архітэктуры і мастацтва, культуролагаў, прадстаўнікоў філасофска-эстэтычнай думкі, які дазваляе выявіць агульныя прынцыпы і заканамернасці фарміравання і пазіцыяніравання мастацкіх вобразаў.

Архітэктурна-мастацкая дзейнасць як любы працэс знаходзіцца ў бесперапынным развіцці. Зразумець сутнасць і вынік гэтага працэсу становіцца магчымым толькі шляхам аналізу змен канцэпцый, падыходаў, ідэй, увасобленых у архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці на пэўным этапе ў параўнанні з папярэднім і наступным (пры магчымасці). Кожны этап развіцця архітэктуры з'яўляецца сувязным звяном паміж гістарычна сфарміраваным асяроддзем і наватарскім будучым.

Аналіз спецыфікі і эвалюцыі мастацкіх вобразаў архітэктуры Беларусі патрабаваў уліку сусветных тэндэнцый развіцця дойлідства, уплыву савецкіх традыцый на развіццё айчыннай архітэктуры, самабытнасці яе нацыянальных рыс, што дало магчымасць прасачыць і выявіць аналогіі прынцыпаў мастацка-вобразнай выразнасці архітэктуры ў розныя гістарычныя эпохі і ў наш час. Сістэмнае вывучэнне працэсаў і механізмаў трансфармацыі мастацкіх ідэй, задум, вобразаў архітэктуры Беларусі апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст., прынцып гістарызму дазволілі ўпершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве распрацаваць тэарэтычную мадэль паэтапнай эвалюцыі мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры Беларусі ў сусветным кантэксце з вылучэннем пазітыўных і негатыўных бакоў, зразумець і акрэсліць асаблівасці дынамікі развіцця мастацка-вобразнай сістэмы айчыннай архітэктуры, неабходныя для разумення гістарычнай пераемнасці развіцця мастацтва і ацэнкі набыткаў постіндустрыяльнай эпохі.

Актуальнасць тэмы даследавання вызначаецца недастатковай вывучанасцю вобразнага пачатку ў творах сучаснай архітэктуры, яго ролі ў рэалізацыі эстэтычнай функцыі мастацтва, што стала вынікам панавання традыцыйнага падыходу да даследавання эстэтыкі дойлідства, заснаванага на вывучэнні гісторыі развіцця мастацкіх школ, кірункаў, стыляў. Стылявая характарыстыка асаблівасцей мастацтва пэўнага гісторыка-культурнага перыяду з'яўляецца асноўнай, але не дастатковай для раскрыцця зместу мастацка-вобразнай сістэмы сучаснасці.

У айчынных мастацтвазнаўчых даследаваннях апошніх дзесяці год, прысвечаных эвалюцыі сучаснай архітэктуры Беларусі, актуалізуецца праблема шматграннасці яе мастацка-вобразных характарыстык [69; 306; 501]. Як слушна сцвярджае А. Лакотка, «вобразы сучаснай архітэктуры – не адназначны тэкст, а бясконцая колькасць тэкстаў, якія рэцыпіент чытае ў формах лінейных і нелінейных, рэальных і віртуальных, у блобах, што выражаюць розную знакава-сэнсавую самаацэнку, множнасць сэнсаў» [306, с. 186]. Аналіз экзістэнцыі стылявых кірункаў, увасобленых у вобразах сучаснай архітэктуры, не дазваляе аб'ектыўна дэшыфраваць мастацка-эстэтычныя тэксты, у поўнай ступені раскрыць гісторыка-культурныя сэнсы постіндустрыяльнай эпохі, кадзіраваныя сродкамі мастацкай мовы і ўвасобленыя ў вобразах будынкаў, збудаванняў, урбаністычным асяроддзі. Яскравыя прыклады праяў мастацкіх стыляў у сучаснай архітэктуры Беларусі адзінкавыя; у большасці будынкаў, збудаванняў фіксуюцца толькі асобныя іх аспекты – рысы, матывы, намёкі, што выключае адназначнасць меркаванняў адносна эвалюцыі архітэктуры на падставе вылучэння стылявых прыкмет. Недастатковасць тэарэтычнай базы для аналізу сучаснай архітэктуры, сфарміраванай у межах стылявой канцэпцыі, кампенсуецца выкарыстаннем у даследаваннях адносна новых паняццяў, такіх як «блобітэктура» («блабізм») [59], «нелінейная архітэктура» [167], «віртуальная архітэктура» [381; 498], «крэатыўная архітэктура» [306], «параметрызм» [548], «віджэт-архітэктура» [120] і іншых, якія ў большай ступені характарызуюць не прынцыпы, падыходы, умовы або вынік мастацка-эстэтычнага асэнсавання асяроддзя сродкамі аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, канструкцыі (архітэктонікі), формы архітэктурнага аб'екта як сапраўднасць існасці, а сам працэс яго стварэння – мастацкую ідэю, мастацкую задуму, суаднесеныя з ідэаламі эпохі, як ілюзорную магчымасць існасці.

У большасці тэарэтычных прац айчынных даследчыкаў акрэсліваюцца толькі асобныя аспекты праблемы эвалюцыі сучаснай архітэктуры Беларусі: фарміраванне асноў і прынцыпаў кампазіцый жылых раёнаў беларускіх гарадоў (В. Анікін [19; 20; 21; 22; 23; 24]), спецыфіка забудовы магістральных вуліц, грамадскіх цэнтраў гарадоў рэспублікі (Я. Заслаўскі [186; 187; 188; 189]), архітэктура дарог Беларусі (А. Сардараў [433; 434]), асаблівасці і перспектывы развіцця раённай планіроўкі гарадоў (І. Іода [218; 219; 220; 221]), роля ландшафтнай архітэктуры ў фарміраванні аблічча сучаснага беларускага горада (Г. Патаеў [400; 401], А. Сычова [461; 462; 463]), шляхі развіцця горадабудаўніцтва і архітэктуры Беларусі ў пасляваенны перыяд – да 1980-х гг. (А. П. Воінаў і А. А. Воінаў [123; 124]), ахова помнікаў гісторыі і культуры, іх узаемасувязь з наватарскімі мастацкімі вырашэннямі пабудоў (Ю. Чантурыя [496], В. Аладаў [11], В. Чэрнік [500]), нацыянальныя і рэтраспектыўныя рысы беларускай архітэктуры, новыя кірункі ў яе развіцці ў еўрапейскім і сусветным кантэксце (А. Лакотка [283; 284; 305; 306; 307]), народныя традыцыі ў айчынным мастацтве (Я. Сахута [435], С. Сергачоў [438]), адметнасць культавага дойлідства Беларусі розных гісторыка-культурных перыядаў і сучаснасці (Т. Габрусь [132; 133], А. Кулагін [273; 274]), асноўныя кірункі сучаснага жыллёвага будаўніцтва (В. Аладаў [10; 12]), значэнне сродкаў мастацкай выразнасці ў фарміраванні архітэктурных кампазіцый (Я. Аграновіч-Панамарова [4; 5; 394]), этапы эвалюцыі архітэктурных стыляў Беларусі XX – пачатку XXI ст. (А. Шамрук [501; 502]).

Прапанаваны ў манаграфіі новы падыход грунтуецца на комплексным аналізе горадабудаўнічых стратэгій, мастацкіх ідэй і задум, увасобленых у праектах ці рэалізаваных ва ўрбаністычным асяроддзі, атрыбутыўных кампанентаў мастацкіх вобразаў архітэктуры з выяўленнем іх марфалагічных, семіятычных, аксіялагічных уласцівасцей з улікам дамінуючых мастацка-эстэтычных канцэпцый постіндустрыяльнай эпохі ў кантэксце асяроддзя, прасторы і часу. Гэты падыход таксама дазваляе раскрыць адметнасць і прадставіць дынаміку развіцця мастацка-вобразнай сістэмы сучаснасці, ацаніць вынікі архітэктурна-праекціровачнай дзейнасці і вызначыць яе праблемныя аспекты, вырашэнне якіх дазволіць павысіць мастацка-эстэтычныя якасці архітэктуры, акрэсліць тэндэнцыі развіцця архітэктуры Беларусі на падставе выяўлення стратэгічных аспектаў, што вызначаюцца патрабаваннямі соцыума.

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** ... 3

*Глава 1.* **Мастацкі вобраз архітэктуры ў праблемным полі даследавання** ... 7

1.1. Мастацтвазнаўча-эстэтычная думка ... 7
1.2. Інтэрпрэтацыя мастацкіх вобразаў архітэктуры ў кантэксце ідэалогіі савецкай дзяржавы і сацыякультурнай сітуацыі Найноўшага часу ... 34
1.3. Мастацкі вобраз сучаснай архітэктуры як аб'ект даследавання. Праблема выбару метадалагічнага падыходу і інструментарый даследавання ... 58

*Глава 2.* **Мастацкія вобразы сучаснай архітэктуры: тэарэтычная канструкцыя** ... 73

2.1. Феномен прасторы ў архітэктуры ... 73
2.2. Форма як іманентнае выражэнне канцэптуальнай сутнасці архітэктуры. Сімвалізацыя архітэктурнай формы ... 115
2.3. Канструкцыя як інструмент мадэліравання архітэктурных аб'ектаў ... 149
2.4. Кампазіцыя і ансамбль як сродкі фарміравання архітэктурнай і горадабудаўнічай прасторы ... 177

*Глава 3.* **Эксплікацыя мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры Беларусі скрозь прызму прасторава-часавага кантынуума** ... 219

3.1. Прасторава-часавы кантынуум як умова экзістэнцыі мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры ... 219
3.2. Гістарызм у сучаснай архітэктуры: кампраміс, эклектызм, кітч ... 229
3.3. Мастацкія вобразы рэчаіснасці: экстрапаляцыя набыткаў постіндустрыяльнай эпохі ... 264
3.4. Парадыгма мастацкіх вобразаў архітэктуры будучыні ў кантэксце пошуку шляхоў развіцця дойлідства ... 295

**Заключэнне** ... 329

**Літаратура** ... 335

Навуковае выданне

**Захарына** Юлія Юр'еўна

**СУЧАСНАЯ АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ:
эвалюцыя мастацкіх вобразаў
у сусветным кантэксце**

Рэдактар *Т. А. Гарбачэўская*

Мастацкі рэдактар *Т. Д. Царова*

Тэхнічны рэдактар *О. А. Тоўстая*

Камп'ютарная вёрстка *Л. І. Кудзерка*

Падпісана да друку 20.03.2014. Фармат 60×84$^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 23,25+1,86 укл. Ул.-выд. арк. 19,6.
Тыраж 300 экз. Заказ 41.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом
«Беларуская навука». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.